# Справаздача па маніторынгу масавага мерапрыемства “Марш недармаедаў” у Баранавічах

**26 лютага 2017 года ў Баранавічах праходзіла акцыя “Марш недармаедаў”.**

**Высновы:**

1. Можна адзначыць мірны характар масавага мерапрыемства цягам усёй акцыі (калі “арганізатары маюць мірныя намеры і сход мае негвалтоўны характар”). Не было гвалтоўных заклікаў ці агрэсіўных дзеянняў з боку арганізатараў і ўдзельнікаў.
2. Было немагчыма ідэнтыфікаваць на масавым мерапрыемстве супрацоўнікаў праваахоўных органаў праз адсутнасць форменнай вопраткі. Гэты факт перашкаджае высвятліць, хто з’яўляецца ўдзельнікамі, а хто не; якія супрацоўнікі праваахоўных органаў і за што адказныя; застаюцца незразумелымі іх функцыі; а таксама немагчыма вызначыць да якога супрацоўніка міліцыі звяртацца ў экстрэннай сітуацыі.
3. Супрацоўнікі міліцыі не выконвалі свае пазітыўныя абавязкі і пасіўна рэагавалі на спрэчкі выпадковых мінакоў з удзельнікамі акцыі. Звяртаем увагу, што згодна Кіраўніцтву БДІПЧ АБСЕ “Правы чалавека і забеспячэнне правапарадку падчас публічных сходаў”, распрацаванага спецыяльна для супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, асноўныя прынцыпы аховы правапарадку падчас публічных сходаў наступныя: валоданне інфармацыяй, садзейнічанне, камунікацыя і дыферэнцыяваны падыход да ўдзельнікаў сходаў.

**Метадалогія маніторынгу**

РПГА “Беларускі Хельсінкскі Камітэт” і Праваабарончы цэнтр “Вясна” цягам некалькіх гадоў праводзяць сістэматычнае назіранне за масавымі мерапрыемствамі ў Мінску на падставе распрацаванай метадалогіі маніторынгу, якая ўключае ў сябе: набор і навучанне назіральнікаў прынцыпам грамадскага кантролю, стандартам мірных сходаў і метадалогіі назірання; запаўненне анкеты назірання падчас вочнага кантролю; апрацоўка анкет і напісанне маніторынгавай справаздачы. Анкеты назірання за масавымі мерапрыемствамі сумесна распрацаваныя праваабарончымі арганізацыямі і ўключаюць пытанні па магчымасці выканання функцыяў назіральнікаў і СМІ, адносна паводзінаў арганізатараў і ўдзельнікаў масавага мерапрыемства, супрацоўнікаў міліцыі, а таксама наяўнасць хуткай дапамогі. Назіральнікі дапускаюцца да назірання толькі ў выпадку згоды на выкананне правілаў і прынцыпаў назірання (незалежнасць і палітычная нейтральнасць; апісанне фактаў, а не меркаванняў; неўмяшанне ў падзею, за якой назіраюць; прыхільнасць да прынцыпаў права: адмова ад любых формаў гвалтоўных дзеянняў і дыскрымінацыйных практык; карэктныя паводзіны). Падчас выканання сваіх абавязкаў назіральнікі трымаюцца асобна ад удзельнікаў. Яны абазначаныя бэйджам назіральніка і сінімі камізэлькамі.

**Папярэдняя інфармацыя**

Праз інтэрнэт стала вядома, што ў Баранавічах 26 лютага 2017 года рыхтуецца сход, інфармацыя пра што шырока агучвалася ў інтэрнеце, сацыяльных сетках, а таксама праз папяровыя аб’явы на вуліцах гораду.

Падчас правядзення масавага мерапрыемства 26 лютага 2017 года вочна і бесперапынна ажыццяўлялі грамадскі кантроль 3 назіральнікі, якія прайшлі адпаведнае навучанне і былі абазначаныя належным чынам.

**Ход масавага мерапрыемства**

Падчас масавага мерапрыемства былі зафіксаваныя наступныя факты:

- Массавае мерапрыемства адбывалася 26 лютага з 12:05 да 12:55. Каля 12 гадзін на месцы збора пад экранам у пачатку бульвара Хэйнола ад плошчы Леніна пачалі збірацца людзі, якім раздавалі запрашэнні на акцыю “Дзень Волі”. Каля 12:05 выступоўцы запрасілі падысці ўсіх да фантану, дзе па чарзе выступалі праз гукаўзмацняльную апаратуру.

- Назіральнікі налічылі каля 300 удзельнікаў. Супрацоўнікі міліцыі былі не абазначаныя, прыблізна 30 чалавек па асаблівасцях лакалізацыі, рацыях былі падобныя да праваахоўнікаў.

- Некаторы час на прыпынку “пл.Леніна” не спыняўся грамадскі траншпарт па незразумелых прычынах.

- Апошнія 20 хвілін выступаў адбываліся паралельна з працай 2 трактароў па зачыстцы снег пад кінатэатрам “Кастрычік”.

- Удзельнікі выкрыквалі лозунгі «Нет декрету №3 – Лукашенко уходи», «Жыве Беларусь».

- З сімволікі удзельнікі выкарыстоўвалі балонікі, а таксама на плечах былі 3 сцягі: дзяржаўны, бела-чырвонабелы і сцяг прафсаюзаў РЭП.

- плакаты і транспаранты адсутнічалі.

- збоку натоўпу адбылося які мінімум 2 гучныя спрэчкі з людзьмі іншага меркавання, на якія супрацоўнікі міліцыі не рэагавалі.

- перашкодаў працы СМІ і назіральнікам не было, у дачыненні да назіральніцы быў грубы зварот з боку супрацоўніка ў цывілай вопратцы.

**Рэкамендацыі**

*Супрацоўнікам праваахоўных органаў:*

* у адпаведнасці з арт.5 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб органах унутраных спраў" "дзейнасць органаў унутраных спраў з'яўляецца галоснай". Кіруючыся гэтай нормай, прапануем, каб усе супрацоўнікі ажыццяўлялі ахову грамадскага парадку падчас масавых мерапрыемстваў у форменнай вопратцы, а таксама былі пазначаныя ідэнтыфікацыйнымі сродкамі (бэйджамі ці нагруднымі знакамі);

* выконваць пазітыўныя абавязкі па спрыянні рэалізацыі права на мірныя сходы, ахоўваць удзельнікаў ад контр-дэманстрацый;

* абазначаць кантактную асобу з ліку супрацоўнікаў міліцыі для камунікацыі з назіральнікамі, СМІ і арганізатарамі масавага мерапрыемства;

* устрымацца ад зменаў руху грамадскага транспарту без відавочнай неабходнасці.

*Суб'ектам, якія валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы:*

* ініцыяваць змены ў беларускае заканадаўства з мэтай прывядзення яго ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі ў галіне свабоды мірных сходаў.